Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
____________ А.Я.Корсакава
«05» _01____ 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД-2956/эвуч.

# АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 12 Музейная справа*
*і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках)*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі І ступені ОСВО 1-23 01 12-2013 па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), вучэбных планаў установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны ( па напрамках). Рэгістрацыйныя нумары Е 23-1-87/17вуч., Е 23-1-86/17вуч. ад 4 ліпеня 2017г.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. А. Трусаў,* дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

*А. А. Мяцельскі*, загадчык адзела гісторыі Беларусі IX-XVIII стст, дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі НАН Беларусі». доктар гістарычных навук;

*А.Л.Іванова*, намеснік дырэктара па лічбавых тэхналогіях і сувязях з грамаднасцю дзяржаўнай установы «Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь», кандыдат культуралогіі.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 29.01.2021г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №4 ад 14.04.2021г.)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя беларускай рэстаўрацыі налічвае некалькі стагоддзяў і за гэты час адносіны да гісторыка-культурнай спадчыны неаднаразова мяняліся. Першыя спробы кансервацыі і захавання помнікаў некаторых унікальных помнікаў архітэктуры сягаюць у канец XIX-пачатак XX ст. Пасля 1921 г., калі Беларусь была падзелена паміж Расіяй і Польшчай, у Заходняй Беларусі плённа працавалі польскія кансерватары, а на тэрыторыі БССР пасля кароткага перыяду беларусізацыі пачалося шматгадовае змаганне з рэлігіей і масавае знішчэнне ці перабудова архітэктурных аб'ектаў. Зараз у незалежнай Беларусі аднаўляюцца некаторыя шэдэўры архітэктуры і праблема кансервацыі і рэстаўрацыі набывае важнае значэнне.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» прызначана для студэнтаў спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» дапаможа ў іх падрыхтоўцы да ўмоў работы ў сучасным музеі, у тым ліку рэгіянальным, а таксама падчас правядзення тэматычных экскурсій.

Мэтай выкладання вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» з'ўляецца вывучэнне студэнтамі сучаснага стану і перспектыў кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх помнікаў гісторыі і культуры.

Адпаведна азначанай мэце пастаўлены наступныя *задачы,* якія павінны быць вырашаны ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны:

- прасачыць на фактычным матэрыяле гісторыю станаўлення і развіцця беларускай рэстаўрацыі;
- вызначыць уплыў сацыяльна-эканамічнага, унутрыпалітычнага і культурнага развіцця на сучасны стан помнікаў беларускага дойлідства.
- засвоіць агульныя тэарэтычныя палажэнні сучасных інфармацыйных і музейных тэхналогій у сферы кансервацыі і рэстаўрацыі і выкарыстання іх у сучаснай музейнай дзейнасці;
- азнаёміць з новымі рэстаўрацыйнымі тэхналогіямі і магчымасцю іх ужывання ў дзейнасці рэспубліканскіх і рэгіянальных музеяў;
- вывучыць вопыт выкарыстання рэстаўрацыйных тэхналогій у розных відах музейнай дзейнасці;
- азнаёміць з вопытам укаранення новых тэхналогій ў замежнай і айчыннай рэстаўрацыйнай прасторы.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны ( па напрамках ):

Акадэмічныя кампетэнцыі:

– АК-1. Валодаць і ўмець ужываць базавыя навукова-теарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

Сацыяльна-асобасные кампетэнцыі:

– СЛК-6. Лагічна, аргументавана і ясна будаваць пісьмовую і вусную размову, выкарыстоўваць навыкі публічнай размовы, вядзення дыскусіі і палемікі.Умець працаваць у камандзе.

– СЛК-7 Умець фармавць і абараняць уласнае меркаванне

Прафесійныя кампетэнцыі:

– ПК-1. Планаваць, арганізоўваць і ўдасканальваць дзейнасць службаў кіравання музейнай справай, аховай гісторычна-культурнай спадчынай, адукацыі і турызма.

– ПК-2. Планаваць, арганізоўваць і весці менеджэрскую, маркетынгавую і фінансавую працу.

– ПК-6. Умець фармуліраваць задачы па праектаванню, эксплуатацыі і ўдасканаленню (ў сферы інфармацыйнага забеспячэння) стацыянарных музейных экспазіцый, выстаў і турыстычных маршрутаў.

Аналітычная дзейнасць.

– ПК-14. Планаваць, арганізоўваць і праводзіць навукова-метадычную і вучэбна- метадычную працу.

– ПК-15 Праводзіць кансультацыі на пытаннях музейнай справы, арганізацыі турызма і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

- асноўныя этапы гісторыі станаўлення рэстаўрацыі і кансервацыі.
- сучасныя тэндэцыі развіцця тэорыі і практыкі кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры.
- асноўныя рэстаўрацыйныя і кансервацыйныя тэхнікі і прыёмы;
- рэстаўрацыйную этыку;
- асноўныя тэрміны і прынцыпы рэстаўрацыйнай і кансервацыйнай дзейнасці;

Студэнты павінны *ўмець:*

- праводзіць экстраныя кансервацыйныя работы;
- выбіраць дакладныя кансервацыйныя методыкі;

- арганізоўваць аптімальна рэжым захавання аб'ектаў культурнай спадчыны;

Студэнты павінны *валодаць:*

- асновамі правядзення кансервацыйных і рэстаўрацыйных работ;
- метадалогіяй інвентарызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.
- асноўнымі патрабаваннямі да рэстаўратара.

Праграма па вучэбнай дысцыпліне «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца студэнтам: «Археалогія», «Гісторыя архітэктуры», «Гістарычнае краязнаўства»,«Гісторыя матэрыяльнай культуры», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» і інш.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» прадугледжана 68 гадзін, з іх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 12 гадзін, семінарскія заняткі – 4 гадзіны, практычныя заняткі –18 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Уводзіны*

Актуальнасць, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры», яе месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Прадмет вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны. Асноўныя віды заняткаў і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў, форма кантролю. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнай дысцыпліны. Віды работ на матэрыяльных каштоўнасцях.

### *Тэма 1. Сістэма крытэрыяў гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дзяржаўны спіс гісторыка- культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя крытэрыі каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры ў СССР: гістарычная каштоўнасць, горадабудаўнічая каштоўнасць, архітэктурна-эстэтычная каштоўнасць, эмацыйна-мастацкая каштоўнасць, навукова-рэстаўрацыйная каштоўнасць, функцыянальная каштоўнасць. Класіфікацыя каштоўнасцей у Рэспубліцы Беларусь. Крытэрыі адбору каштоўнасцей. Механізм уключэння музейных прадметаў у дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Зберажэнне і аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцей. Кодекс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016).

## Раздзел І. Рэстаўрацыйная практыка ў Еўропе ў XIX- пачатку XX стст.

### *Тэма 2. Рэстаўрацыя помнікаў Еўропе ў XIX - пачатку XX стст. Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі*

Першая спроба захавання помнікаў гісторыі і культуры ў Старажытных Грэцыі і Рыме. Эдыкт імператара Майорыяна (458г. н.э.) і ўказ караля Тэадорыха Вялікага (VI ст. н.э.). Булы рымскіх папаў Паўла II і Сікста IV (XV ст.). Рэстаўрацыя аббатства Сен Мексен у Францыі (канец XVII ст.). Указы Пятра I аб ахове і захаванні помнікаў гісторыі ў Расіі.

Дэкрэты Нацыянальнага Канвента Францыі (кан. XVIII ст.). Адкрыццё музея ў Луўры.(1793г.) Музей французскіх помнікаў А.Ленуара (1795 г.).

Спробы рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры ў эпоху рамантызму ў Англіі, Германіі, Францыі. В. Гюго і яго раман «Сабор Парыжскай Божай Маці». Як фактар канцэнтрацыі ўвагі французаў да праблемы аховы сваей гістарычнай спадчыны.

Дзейнасць М.М.Карамзіна ў Расіі. Стварэнне Генеральнай інспекцыі гістарычных помнікаў у Францыі (1830 г.) і яе дзейнасць. Рэстаўрацыя Маскоўскага Крамля і лёс Кітай-горада ў Маскве.

Эпоха стылістычных рэканструкцый. Э.Э. Віяле-ле-Дзюк – заснавальнік школы французскіх рэстаўратараў. Рэстаўрацыя сабора Парыжскай Божай Маці. Аднаўленне замкаў у Каркасоне і П'ерфоне. Рэстаўрацыя сабора ў Руане архітэктарам Ж.А. Алавуанам.

***Тэма 3. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры у СССР і БССР***

Нацыяналізацыя помнікаў гісторыі і культуры пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Дэкрэт СНК ад 5 кастрычніка 1918 г. Стварэнне Расійскай Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (1919 г.).

Рэстаўрацыя помнікаў Масквы ( Крэмль, сабор Пакрова на Рву, Кітай-горад, палаты князя В.В. Галіцына, Казанскі сабор на Краснай плошчы).

Стварэнне дзяржаўных рэстаўрацыйных майстэрань. І.Э. Грабар – тэарэтык савецкай рэстаўрацыі. П.Д. Бараноўскі і яго рэстаўрацыйная дзейнасць. Рэстаўрацыя помнікаў Сярэдняй Азіі. Закрыццё рэстаўрацыйных майстэрань. Сталінскія рэпрэсіі. Масавае знішчэнне культавых помнікаў архітэктуры. Страты СССР і БССР у галіне гісторыка-культурнай спадчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Дзейнасць Камісіі па ахове і аднаўленні помнікаў мастацтва. Стварэнне спецыяльных праектна-вытворчых рэстаўрацыйных майстэрняў у гістарычных гарадах СССР. Аднаўленне разбураных пад час вайны помнікаў Ленінграда і яго прыгарадаў. Рэстаўрацыя Пятніцкай царквы канца XII—пачатку XIII ст. у Чарнігаве. Аднаўленне помнікаў Ноўгарада і Пскова.

Чарговая «хваля» ваяўнічага атэізму ў эпоху М.С. Хрушчова Разбурэнне помнікаў культавай архітэктуры. Запрашэнне для аднаўлення помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Таліна і Рыгі польскіх рэстаўратараў (старыя гарады Таліна і Рыгі).

Развіццё савецкай рэстаўрацыі ў 1970-80-х гг. Стварэнне рэспубліканскіх таварыстваў па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Змены ў савецкім заканадаўстве. Змены ў адносінах да культавых помнікаў у часы перабудовы. Стварэнне савецкага Фонду культуры і часопіса «Наследие».

## Раздзел II. Гісторыя беларускай рэстаўрацыі і аховы помнікаў

### *Тэма 4. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ( 1921 – 1939 гг.)*

Польскае заканадаўства і структура кансерватарскіх устаноў у краіне. Вяртанне храмаў каталіцкай царкве.

Дзейнасць Я. Клоса, Я\ Драздовіча і Я. Ядкоўскага. Кансервацыя беларускіх замкаў. Рэстаўрацыя замка ў Міры. Аднаўленне касцёла XVI ст. у в. Гнёзна Ваўкавыскага раёна. Роля рэстаўрацыйных зборнікаў «Ахова помнікаў мастацтва (1931, 1932 гг.)». Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні і яго калекцыі, будаўнічых матэрыялаў.

Археалагічныя раскопкі ў Гродне. Адкрыццё Верхняй і Ніжняй цэркваў і рэштак княжаскага палаца XII ст. на тэрыторыі Старога Замка. Вывучэнне Каложскай ( Барысаглебскай ) царквы. Аднаўленне дзейнасці Віленскага універсітэта і яго роля ў вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны.

### *Тэма 5. Вывучэнне, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР*

Роля Інстытута беларускай культуры і часопіса «Наш край» у вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі. Дзейнасць І.М. Хозерава і М.М. Шчакаціхіна. Краязнаўчы рух у БССР і яго заняпад. Знішчэнне і перабудова помнікаў архітэктуры ў 1930-я гг. XX ст. на тэрыторыі БССР. Страты падчас Другой сусветнай вайны. Праблема вяртання помнікаў гісторыі і культуры.

Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Дзейнасць І.М. Хозерава і П.Д. Бараноўскага. Раскопкі помнікаў архітэктуры XII–XIII стст. Стварэнне Археалагічнага музея «Бярэсце». Хрушчоўскі валюнтарызм у Беларусі і яго наступствы. Стварэнне СНРВМ спецыяльных навуковых рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў МК БССР (1968–1969 гг.) Аднаўленне капліцы-спачывальні Паскевічаў у Гомелі і Праабражэнскай царквы ў Заслаўі. Рэстаўрацыя Полацкай Сафіі. Дзейнасць архітэктараў-рэстаўратараў В.Р. Слюнчанкі, С.Г. Багласава і С.А. Друшчыца.

Рэканструкцыя Траецкага прадмесця ў Мінску (1980 г.). Ажыццяўленне прынцыпу «рэваларызацыі». Рэстаўрацыя станковага і фрэскавага жывапісу, старажытнай скульптуры і разьбы. Беларускі навукова-даследчы рэстаўрацыйны інстытут «Белспецпраектрэстаўрацыя» і яго дзейнасць. Стварэнне Мемарыяльнага комплексу “Брэсцкая крэпасць-герой”.

Рэстаўрацыя у савецкі і постсавецкі перыяд. Аднаўленне беларускіх ратуш. Вяртанне храмаў вернікам і праблемы іх рэстаўрацыі. Рэстаўрацыя і музеефікацыя беларускіх замкаў.

Прапановы Міністэрства культуры па ўключэнні найбольш унікальных помнікаў Беларусі ў Сусветны спіс культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Міжнародны дзень помнікаў і мясцін і яго святкаванне ў Беларусі (18 красавіка).

### *Тэма 6. Праблема кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў (Мірскі, Крэўскі, Несвіжскі, Навагрудскі і Лідскі замкі)*

Архітэктурна-археалагічнае вывучэнне Мірскага замка. Праблемы яго аднаўлення і прыстасавання. Рэстаўрацыя замка ў 1920—30-я гг. Наданне помніку статусу аб'екта сусветнай спадчыны. Лёс Мірскай капліцы пачатку XX ст. і касцёла ў Міры. Сучасны стан Мірскага замка.

Гісторыя будаўніцтва і рэстаўрацыі палаца-паркавага ансамбля ў Нясвіжы. Дзейнасць Антона Радзівіла і яго жонкі. Адбудова Нясвіжскай ратушы. Сучасны стан Нясвіжскага замка.

Трагічны лёс Крэўскага замка ў Першую Сусветную вайну. Кансервацыя польскіх спецыялістаў. Археалагічнае вывучэнне і спроба кансервацыі ў канцы XX ст. Рух моладзі ў абарону Крэўскага замка. Аднаўленне Крэўскага замка ў апошнія гады.

Замак-кастэль у Лідзе. Гісторыя вывучэння. Рэстаўрацыя-рамонт у пачатку XX ст., дзейнасць польскіх кансерватараў. Праект кансервацыі, рэстаўрацыі і прыстасавання Лідскага замка ў 1980-я гг. Сучасныя праблемы аднаўлення і прыстасавання, Лідскага замка.

### *Тэма 7. Праблема кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінска*

Планіроўка сярэднявечнага Менска ў XV—XIX стст. Узнікненне Троіцкага і Ракаўскага прадмесцяў. Археалагічнае вывучэнне і знішчэнне Менскага замчышча. Кальварыйскі гісторыка-культурны комплекс. Рэгенерацыя Траецкага прадмесця. Аднаўленне касцёлаў Святога Роха, Святых Сімона і Алены і цэркваў Пятра і Паўла і Святой Марыі Магдалены. Адбудова помнікаў савецкага перыяда. Лошыцкі парк і сядзіба. Праблемы іх рэканструкцыі і прыстасавання.

### *Тэма 8. Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска*

Узнікненне Верхняга горада як архітэктурнага ансамбля у XVI—XVIII ст. Плошча Свабоды і яе забудова. Разбурэнне помнікаў архітэктуры і іх перабудова ў 1930-х, 1950-60-я гг. Знішчэнне забудовы Мінскага замчышча і вуліцы Няміга. Праект поўнага знішчэння Верхняга горада ў 1970-х гг.

мінулага стагодзя. Змаганне беларускай інтэлігенцыі за яго захаванне і іх перамога.

Аднаўленне помнікаў Верхняга горада ў пачатку 1990-х гг. дзейнасць акцыянернага таварыства «Стары Менск». Адбудова і прыстасаванне кляштара базіліянак, «Дома масонаў , «сядзібы Ваньковічаў», гандлёвых радоў і Мінскай ратушы. Праблема аднаўлення Свята-Духаўскай царквы XVII ст. Аднаўленне польскімі рэстаўратарамі былога езуіцкага касцёла XVIII ст. Рэканструкцыя жылой забудовы і знос асобных будынкаў на тэрыторыі Верхняга горада.

## Раздзел III. Тэорыя і практыка сучаснай рэстаўрацыі

### *Тэма 9.* Рэстаўрацыя мемарыяльных садоў і паркаў

Праблема рэстаўрацыі і прыстасавання помнікаў сядзібна-паркавай архітэктуры. Неабходныя ландшафтныя працы: добраўпарадкаванне і пасадка новых зялёных насаджэнняў.

Плён супрацоўніцтва архітэктараў-рэстаўратараў і садоўнікаў-дэкаратараў. Рэстаўрацыйныя работы на сядзібах і парках у Гомелі, Жылічах, Снове Хальчы і Свяцку. Аднаўленне гістарычных паркаў у Нясвіжы і Міры. Праблема аднаўлення Лошыцкага парку ў Мінску. Захаванне гарадскіх сквераў і бульвараў. Аднаўленне садова-паркавай скульптуры і малых архітэктурных формаў. Мемарыяльныя сядзібы, ператвораныя ў музеі (Завоссе і Залессе).

### *Тэма 10. Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў народнага дойлідства*

Захаванне помнікаў драўлянага дойлідства. Узнікненне музеяў пад адкрытым небам у Заходняй Еўропе і СССР. Дзяржаўны гісторыка-архітэктурны музей “Кіжы”. Стварэнне Беларускага дзяржаўнага музея-скансена. Праблема народнай архітэктуры і побыту, захавання драўляных помнікаў архітэктуры ў вялікіх гарадах. Гродзенскі лямус XVII ст. Культавае драўлянае дойлідства Беларусі, праблемы захавання і рэстаўрацыі. Рэшткі драўляных будынкаў, знойдзеныя пры археалагічных раскопках, іх кансервацыя і захаванне. Сушка археалагічнага дрэва ў камеральных умовах.

### *Тэма 11. Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва. «Археалагічнае» дрэва. Археалагічны музей “Бярэсце”*

Рэстаўрацыя вырабаў з дрэва. «Археалагічнае дрэва». Метад кансервацыі «археалагічнага» дрэва. Методыка прафесара В.Е. Віхрова. Этнаграфічныя экспанаты з дрэва і іх захаванне. Змаганне з біялагічнымі шкоднікамі. Гісторыя стварэння археалагічнага музея ў Брэсце.

Кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з бяросты. Берасцяныя граматы і іншыя вырабы з бяросты. Метад дэндрахраналогіі для датыроўкі старажытнага дрэва. Захаванне гербарыяў у музейных фондах і экспазіцыях. Захаванне і рэстаўрацыя вырабаў з паперы і картону.

### *Тэма 12. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з керамікі, шкла, скуры і косці*

Археалагічная кераміка. Апрацоўка і захаванне ляпной керамікі эпохі неаліта, бронзы і жалезнага века. Рэстаўрацыя ганчарнай керамікі. Дагіпсоўка і таніраванне . Стварэнне муляжоў. Рэстаўрацыя кафлі і кафляных печаў. Будаўнічая кераміка. Вырабы са скуры знойдзеныя пад час археалагічных раскопак. Іх апрацоўка і захаванне. Вырабы са скуры і футра ў музейных экспазіцыях і фондах. Археалагічныя знаходкі зробленныя з косці. Іх апрацоўка і кансервацыя. Рэстаўрацыя вырабаў з косці. Антрапалагічныя калекцыі ў музеях.

З'яўленне шкляных вырабаў на Беларусі ў эпоху бронзы і жалезнага веку. Антычнае і ўсходняе шкло. Візантыйскае шкло на тэрыторыі Беларусі. З'яўленне шкларобаў ў Беларусі. Беларускае гутнае шкло. Археалагічнае шкло. Ірызацыя археалагічнага шкла. Вырабы з каляровых эмаляў і іх захаванне. Венецыянскае і багемскае шкло на Беларусі. Ювелірныя вырабы са шкла. Люстэркі і жырандолі. Рэканструкцыя шкляных вырабаў.

### *Тэма 13. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя металічных вырабаў.*

Рэстаўрацыя металічных вырабаў. Механічны, хімічны і электрахімічны спосабы. Нумізматычныя калекцыі і іх захаванне. Расчыстка манет, знойдзеных падчас археалагічных раскопак. Захаванне вырабаў з каштоўных металаў. Вырабы з волава. "Алавяная чума". Свінцовыя вырабы і іх захаванне. Медныя і бронзавыя вырабы. Віды паціны. Іржа на жалезных вырабах. Вырабы з жалеза ў музейных экспазіцыях. Спосабы прафілактыкі. "Гарматнае сала". Чыстка паліраваных, воранёных і інкруставаных вырабаў.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КРС | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Практычныя заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | | |
| Тэма 1. Сістэма крытэрыяў гісторыка-культурных каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь | 1 | | | | |
| Раздзел I. Рэстаўрацыйная практыка ў заходняй Еўропе ў XIX – пачатку XX ст. | | | | | |
| Тэма 2. Рэстаўрацыя помнікаў Еўропы XIX – пачатку XX стст. Фармаванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі | 2 | 2 | | | |
| Тэма 3. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР і БССР | 2 | | | | |
| Раздзел II. Гісторыя беларускай рэстаўрацыі і аховы помнікаў | | | | | |
| Тэма 4. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) | | | 2 | | |
| Тэма 5. Вывучэнне, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР | 2 | | 2 | | |
| Тэма 6. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў (Мірскі, Крэўскі, Нясвіжскі, Навагрaдскі і Лідскі замкі) | | | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 7. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінска | 2 | | | 2 | Тэставае заданне, письмовая работа |
| Тэма 8. Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска | | 2 | | | |
| Раздзел III. Тэорыя і практыка сучаснай рэстаўрацыі | | | | | |
| Тэма 9. Рэстаўрацыя мемарыяльных садоў і паркаў | | | 1 | | |
| Тэма 10. Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў народнага дойлідства | | | 1 | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Раздзел IV. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя музейных экспанатаў | | | | | |
| Тэма 11. Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва. «Археалагічнае» дрэва. Археалагічны музей “Бярэсце” | | | 2 | 2 | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 12. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з керамікі, шкла,скуры, косці | | | 2 | | |
| Тэма 13. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя металічных вырабаў | | | 2 | | |
| Усяго: | 10 | 4 | 14 | 6 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная:*


1. Абрамова, П. В. Методика сохранения и актуализации объектов культурного наследия [Электронный ресурс]: учеб. пособие / П. В. Абрамова. — Кемерово : КемГИК, 2020. — 112 с. — Режим доступа : https://e.lanbook.com/book/174700. – Дата доступа: 11.01.2022.
2. Лемытская, Д. Е. Информационные технологии в реставрации архитектурного наследия [Электронный ресурс] : учеб. пособие / Д. Е. Лемытская. — Красноярск : СФУ, 2020. — 36 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/181667. – Дата доступа: 11.01.2022.
3. Миронова, А. Ф. Экспертиза и атрибуция изделий декоративно-прикладного искусства : учеб. пособие для студентов высших учебных заведений, обучающихся по укрупненной группе специальностей 54.03.00 "Изобразительное и прикладные виды искусств" / А. Ф. Миронова. - 2-е изд. – М. : ФОРУМ : ИНФРА-М, 2021. - 94, [1] с. : ил.
4. Сафонов, А. А. Музейное дело и охрана памятников : учеб. и практикум для вузов / А. А. Сафонов, М. А. Сафонова. — 2-е изд. — М. : Издательство Юрайт, 2021. — 332 с. — (Высшее образование).
5. Сокольская, О. Б. Ландшафтная архитектура. Основы реконструкции и реставрации ландшафтных объектов : учеб. пособие / О. Б. Сокольская, В. С. Теодоронский. — 2-е изд., стер. — СПб. : Лань, 2020. — 332 с.
6. Трусаў, А. А. Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI - XVIII тст. : [манаграфія] / А. А. Трусаў. - Мінск : БДУКМ, 2020. - 305 с. : каляр. іл.
7. Шайхутдинова, А.Р. Основы реставрации [Электронный ресурс]: учеб. пособие : / А. Р. Шайхутдинова, Р. Р. Сафин, А. Ф. Гараева . – Казань : Казанский научно-исследовательский технологический университет (КНИТУ), 2018. – 108 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=612759. – Дата доступа: 05.05.2021.
8. Шляхтина, Л. М. Основы музейного дела: теория и практика : учеб. пособие / Л. М. Шляхтина. — 7-е изд., стер. — СПб. : Планета музыки, 2021. — 248 с.


*Дадатковая*


1. Агееў, А.Р. Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне / А. Агееў, А. Трусаў. – 2-е выд., папр. І дап. – Магілёў: Магіл. абл. узбуйн. друк. 2010. – 160 с.

2. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-я годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

3. Алексеев, Ю. В. Объекты культурного наследия : учеб. В 2 т. Т. 1, 2 / Ю. В. Алексеев, Г. Ю. Сомов. – М. : Проспект, 2016. - 557 с.

4. Алексеев, Ю. В. Объекты культурного наследия : учеб. Т.1, 2 / Ю. В. Алексеев, Г. Ю. Сомов. – М. : Оригинал-макет, 2017. – 557 с.

5. Багласаў, С. Г. Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі / С. Г. Багласаў // Помнікі старажытнай беларускай культуры. Новыя адкрыцці. – Мінск, 1984. – С. 126–132.

6. Багласов, С. Г. Возрождение исторического центра Минск (1980-2016 гг.): научно-реставрационный отчёт научного руководителя объекта (документальная хроника) / С. Г. Багласов. – Минск: Издатель Змітер Колас, 2019. – 124 с.

7. Беларуская кафля / А. А. Трусаў [і інш.]; пад рэд. С. А. Мілючэнкава. – Мінск: Беларусь, 1989. – 150 с.

8. Гліннік, В. В. Неабходнасць стратэгіі захавання архітэктурнай спадчыны Беларусі савецкага перыяду / В. В. Гліннік // Каштоўнасці мінуўшчыны – 6: Гіст. цэнтры гарадоў Беларусі: праблемы і шляхі іх вырашэння: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Мінск, 28 лістап. 2002 г. / пад агул. рэд. С. В. Марцэлева. – Мінск, 2003. – С. 45–57.

9. Калнін, В. В. Мірскі замак / В. В. Калнін. – 2-е выд. – Мінск : Беларусь, 2005. – 155, [4] с.

10. Кимеева, Т. И. Основы консервации и реставрации археологических и этнографических музейных предметов : учеб. пособие / Т. И. Кимеева, И. В. Окунева. – Кемерово : Кемеровский государственный университет культуры и искусств (КемГУКИ), 2009. – 252 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=228103. – Дата доступа: 05.05.2021.

11. Клепиков, Н. Е. Памятники истории и культуры Беларуси (конец XVIII – первая треть XX в.). Проблемы сохранения / Н. Е. Клепиков. – Минск : Издательский центр БГУ, 2015. – 471 с.

12. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : [прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г.] : уступае ў сілу з 3 лют. 2017 г. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 270 с.

13. Локотко, А.И. Архитектурное наследие Беларуси: развитие традиций, охраны и реставрация / А. И. Локотко. – Минск: Право и экономика, 2004. – 303 с.

14. Мартыненко, И.Э. Законодательство об охране историко-культурного наследия и прокурорский надзор за его исполнением. / И. Э. Мартыненко. – Минск: Тесей, 2001. – 245 с.

15. Миронова, А. Ф. Экспертиза и атрибуция изделий декоративно-прикладного искусства : учеб. пособие для студентов высших учебных заведений, обучающихся по укрупненной группе специальностей 54.03.00 «Изобразительное и прикладные виды искусств» / А. Ф. Миронова. – 2-е изд. – М. : ФОРУМ : ИНФРА-М, 2021. – 94 с.

16. Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеіфікацыі. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, 4 чэрвеня 2005 г. г.п. Мір, Гродзенская вобл. / Нав. рэд. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск: ТАА «Белпрынт», 2006. – 192 с.

17. Михайловский, Е. В. Реставрация памятников архитектуры / [предисл. П. Максимова] ; Науч.-исслед. ин-т теории, истории и перспективных проблем сов. архитектуры. – М. : Стройиздат, 1971. – 190 с.

18. Памятники всемирного наследия / Кисель В.П. и др. – Мн.: БелЭн, 1998. – 288 с.

19. Подъяпольский, С. С. Основы реставрации памятников архитектуры / С. С. Подъяпольский. – М.: Стройиздат, 1983. – 270 с.

20. Реставрация, исследование и хранение музейных художественных ценностей. Выпуск 2. Технические средства освещения музеев и реставрационных мастерских. – М.: Наука, 1984. – 48 с.

21. Реставрация, исследования и хранение музейных и художественных ценностей. Полевая консервация археологических находок в СССР и за рубежом. Выпуск 1. – М.: Наука, 1984 – 30 с.

22. Рыцарев, К. В. Европейская реставрационная мысль в 1940–1980-е годы: пособие для изучения теории архитектурной реставрации / К. В. Рыцарев, А. С. Щенков. – Изд. 3-е. – М.: URSS, Ленанд, 2017. – 92, [1] с.

23. Слюнченко, В.Г. Полоцкий Софийский собор. Историко-архитектурный очерк. / В. Г. Слюнченко. – Мн.: Полымя, 1987. – 240 с.

24. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя і інш. ; Уклад. Габрусь Т.В.. – Мінск: Полымя, 1998. – 351 с.

25. Трусаў, А.А. Мінулае і сучаснасць Лідскага замка / А. А. Трусаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – №6. – С. 21-23.

26. Трусаў А.А. Манументальнае дойлідства Беларусі XI-XVIII стст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. /А. А. Трусаў– Мінск: ТАА «Лекцыя», 2001. – 204 с.

27. Трусаў, А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А.А. Трусаў : Мінск: Харвей, 2015. – 464 с.

28. Трусаў, А. Беларускія кафляныя печы / А. А. Трусаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – №5. – С. 4–17.

29. Трусаў, А. А. Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI – XVIII стст. / А. А. Трусаў. – Мінск: БДУКМ, 2020. – 306 с.

30. Шайхутдинова, А.Р. Основы реставрации : учеб. пособие / А. Р. Шайхутдинова, Р. Р. Сафин, А. Ф. Гараева . – Казань : Казанский научно-исследовательский технологический университет (КНИТУ), 2018. – 108 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=612759. – Дата доступа: 05.05.2021.

**31.** Школа музейных кансерватараў: бытавая кераміка, этнаграфічны тэкстыль: навукова-метадычны матэрыял / Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры, Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі; укладальнік А. Б. Сташкевіч; навуковы рэдактар Л. У. Дамнянкова. – Мінск: БелДІПК, 2005. – 75 с.

## Характарыстыка рэкамендуемых метадаў выкладання

Пры арганізацыі выкладання вучэбнай дысцыпліны «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры» рэкамендуецца выкарыстоўваць традыцыйныя формы і метады навучання: лекцыйныя і семінарскія заняткі, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, вопыту фарміравання і выкарыстання інструментарыя вучэбна-даследчай дзейнасці, ролевага і імітацыйнага мадэлявання, магчымасці творча засвойваць новы вопыт, вылучаюцца тэхналогіі: праблемнага навучання; развіцця крытычнага мыслення; праектнага навучання; камунікацыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; метад аналізу канкрэтных сітуацый; іншыя інавацыйныя і інтэрактыўныя методыкі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў на адпаведную тэматыку, мультымедыя прэзентацый па асобных падраздзелах курса, вывучэнне дадатковых крыніц і літаратуры, агляд і аналіз інтэрнэт-крыніц па тэме і інш.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне навыкаў пошуку і аналізу розных відаў інфармацыі;

– засваенне, сістэматызацыю і трансляцыю атрыманых ведаў у будучай прафесійнай дзейнасці;

– развіццё дадатковых навукова-даследчых навыкаў.

Кантроль за выкананнем самастойнай работы з'яўляецца бягучым і рэалізуецца праз электронную пошту, індывідуальныя кансультацыі, падчас лекцыйных і семінарскіх заняткаў, а таксама на заліку.

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

Арганізацыя вучэбнай работы студэнтаў накіравана на засваенне лекцыйнага матэрыялу, а таксама на самастойны пошук і падрыхтоўку інфармацыйных матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне.

Для дыягностыкі атрыманых магістрантамі ведаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– тэставыя заданні па асобных падраздзелах і дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя работы па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– мультымедыя прэзентацыі па асобных падраздзелах дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па самастойна падрыхтаваных тэмах.